***М.В. Яхнавец***

ВА РБ (Мінск)

# МІКАЛАЙ УЛАШЧЫК ЯК ПОСТАЦЬ БЕЛАРУСКАЙ ГІСТАРЫЧНАЙ НАВУКІ

“Змагару за гістарычную праўду Беларусі” – гэтыя словы сталі развітальнымі і былі напісаны на жалобным вянку, прывезенным з Мінска ў Маскву на апошняя спатканне з Мікалаем Мікалаевічам Улашчыкам 15 лістапада 1986 г. 30 гадоў прайшло ад той смутнай падзеі і за гэты час адбылося і адбываецца вяртанне як добрага імя, так і нескажонай гісторыі Беларусі ў даследаваннях гэтага маскоўскага беларуса.

Навуковая дзейнасць М. Улашчыка прайшла ў Маскве. Характар яго прац і навуковай методыкі не былі абцяжараны партыйна-савецкай ідыялогіяй., таму і навуковыя працы прынцыпова адрозніваліся ад афіцыйнай канцэпцыі беларускага мінулага з нацыянальным прыніжэннем, адмаўленнем векавых традыцый уласнай дзяржаўнасці, значнай ролі беларусаў у гістарычным развіцці. М. Улашчык абураўся падобнымі публікацыямі і не аднойчы гаварыў: “Гэта ж трэба гэтак сябе не паважаць! Скрозь, бачыце, нас, недарэкаў, няволілі польскія ды літоўскія феадалы, а маскоўскія – баранілі, вызвалялі. І на такой вось лухце ўзгадоўваюць школьнікаў, студэнтаў, будучых гісторыкаў”.

Просты пералік манаграфічных прац М. Улашчыка дае уяўленне аб яго навуковай разнастайнай і фундаментальнай спадчыне: аб аграрных адносінах у Літве і Заходняй Беларусі напярэдадні скасавання прыгону; па археаграфіі і крыніцазнаўству гісторыі Беларусі феадальнага перыяду; пра “Хроніку Быхаўца”, наогул пра беларуска-літоўскія летапісы; не кажучы пра шматлікія артыкулы, рэцэнзіі на малавывучаныя, ўвогуле не распрацаваныя, альбо тэндэнцыйна інтэрпрэтуемыя праблемы нацыянальнай гісторыі (гэта беларуская тапаніміка, айчыннае кнігавыданне, паўстанне 1863 г., спецыфіка мясцовай шляхты, стан пісьменнасці ў дарэвалюцыйнай Беларусі і г.д.). М. Улашчык быў не толькі гісторыкам, але і этнографам, фалькларыстам, бібліёграфам, літаратарам. Яго праца дае падставы гаварыць аб існаванні ў

прасторы расійскай гістарычнай навукі беларускай школы Улашчыка, якая дзейнічала ў асобе аднага-адзінага настаўніка і была працягнута працай расійскіх або расійска-беларускіх гісторыкаў К. Любаўскага, М. Доўнар-Запольскага, У. Пічэты. Што датычылася гістарычнай праўды – тут Улашчык быў няўступліва-ўпартым, у астатнім – таварыскім, камунікатыўным, сяброўскім беларусам. Ен аднолькава паважаўся як за сваё нацыянальнае самавыяўленне, так і за веданне рускай і сусветнай культуры. Навуковыя погляды нашага беларуса знаходзілі разуменне і падтрымку з боку такіх вядомых расійскіх навукоўцаў як М. Ціхаміраў, М. Нечкіна, В. Пашута, М. Дружынін, А. Нарбут, Ю. Лабынцаў, І. Касцюшка і інш. Да гэтага неабходна дадаць, что вядомасць Улашчыка ў міжнародным навуковым свеце адбывалася менавіта з расійскай інфармацыйнай прасторы. З Масквы яго неардынарныя працы пра Беларусь разыходзіліся па буйнешых бібліятэках, навуковых інстытутаў як СССР, так і Цэнтральна-Усходняй і Заходняй Еўропы, Паўночнай Амерыкі, выклікаючы немалы разгалос. Наогул працы Улашчыка адкрывалі свету і саму Беларусь, яе гістарычную панараму, багатую спадчыну, традыцыі развітай духоўнай і палітычнай культуры, вопыт яе адносін з іншымі краінамі і народамі, многовековега змагання за сваю незалежнасць, а нярэдка – за нацыянальнае самавыжыванне. Улашчык крытыкаваў як надуманыя пафарбаваныя палітыкай міфы аб місійнай ролі царскай Расіі на беларускіх землях, паказваючы сапраўдную, не раз трагічную цану, якую вымушаны былі плаціць беларусы за прымусовае, ганебнае расійскае апякунства.

На пачатку 30-х гадоў XX ст. М. Улашчык был выгнаны з Беларусі, але да апошніх сваіх дзён ён жыў надзеяй вярнуцца. Адбылося гэта толькі ў 1987 г., калі яго прах быў перанесены з Масквы на радзіму. 14 лютага гэтага года споўнілася 110-годдзе нашага славутага суайчынніка. Прафесіяналізм і сумленнасць у спалучэнні з грамадзянскай мужнасцю забяспечылі яму навуковае і грамадскае прызнанне. Усе мы павінны ганарыцца за Мікалая Мікалаевіча і Беларусь, якая вылучыла такого цудоўнага вучонага, чалавека, нашага пабрацiма, асобу светлую і незабыўную.